Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”

# Пазнавальная праграма
# “Чароўныя гукі”

Аўтар:
**Кульбіцкая В.А.**,
культарганізатар
ЦДАДіМ “Ветразь” г.Мінска

**Мінск 2022**

***Пазнавальна-гульнёвая праграма “Чароўныя гукі”***

*Рэквізіт і абсталяванне:* праектар, кампутар, калонкі, лісты з заданнем.
*Мэта:* Праз знаёмства з народнымі традыцыямі, музыкай, танцамі і забавамі паспрыяць з'яўленню зацікаўленасці да культурных каштоўнасцей сярод дзяцей.
*Катэгорыя ўдзельнікаў:* 1-4 класы
*Задачы:*

- Пашырыць веды ў галіне традыцый і звычаяў;
- Прывіць павагу да беларускай культуры;
- Імкненне да захавання культурных каштоўнасцей.

**Вядучая:** Добры дзень, шаноўныя госці! Сёння мы сабраліся з вамі, каб даведацца пра самыя галоўныя музычныя інструменты, якія адносяцца да беларускіх. Можа хто ведае, якія гэта інструменты? **(адказы)** Выдатна! На самай справе іх вельмі шмат, але мы з вамі вылучым некаторыя з іх: гэта – дуда, цымбалы, домра, жалейка, акарына, колавая ліра і трашчотка. І пачнём мы з самага галоўнага, па якому можна адразу здагадацца, што мы беларусы, гэта – дуда.

*Малюнак дуды*

**Вядучая:** На Беларусі дуда вядома з 16 стагоддзя. Гэта народны духавы язычковы інструмент. Лічыцца сакральным інструментам. Гучанне ў яе моцнае і рэзкае. Раней дуда была папулярным інструментам і выкарыстоўвалася для суправаджэння танцаў, песень, прыпевак на сямейных і каляндарных святах, ігрышчах і кірмашах.

*Малюнак цымбал*

**Вядучая:** Цымбалы – струнны ўдарны музычны інструмент. Вядомы таксама з 16 стагоддзя. З’яўляецца ансамблевым, які традыцыйна спалучаецца з гармонікам, скрыпкай, кларнетам, фартэпіяна, бубнам. Ансамблі з удзелам цымбал звычайна іграюць на вяселлях, хрэсьбінах, вечарынках, дзе шмат танцуюць і спяваюць.

*Малюнак акарыны*

**Вядучая**: Акарына – духавы музычны інструмент. З’явілася на Беларусі ў 20 ст. Гучанне мяккае, пяшчотнае і ціхае. Выкарыстоўваецца ў сольных лірычных песнях, бывае і ў танцах.

*Малюнак жалейкі*

**Вядучая:** Жалейка – старажытны духавы язычковы інструмент. Мае таксама назву дудка, ражок, пішчык. Ігралі на жалейцы сола і ў ансамблі са скрыпкай,

цымбаламі, гармонікам. Жалейку выкарыстоўвалі пастухі, калі пасвілі жывёл. А дзеці проста гуляліся з ёю.

*Малюнак ліры*

**Вядучая:** Колавая ліра – народны струнны музычны інструмент. Гук здабываецца трэннем драўлянага кола па струнах, якое прыводзіцца ў рух ручкай. Гучанне манатоннае, жаласлівае. З’явіўся інструмент на Беларусі на мяжы 16-17 стагоддззяў і быў звязаны з побытам лірнікаў - жабркоў. Яны спявалі пераважна духоўныя вершы, павучальныя, гістарычныя песні і тым самым зараблялі сабе на жыццё.

*Малюнак трашчоткі*

**Вядучая:** Трашчотка – самагучальны скрабалкавы музычны інструмент. З’явілася на Беларусі ў другой палове 19 – пач. 20 стагоддзя. Выконвала разнастайныя функцыі: пацяшальную, сігнальна-інфармацыйную, абрадавую і культавую. Вядома як дзіцячая цацка і як гукавое прыстасаванне ў начных вартаўнікоў, якія з яе дапамогай апавяшчалі пра пажар, склікалі на дапамогу, а таксама ў паляўнічых, якія пужалі з яе дапамогай ваўкоў.

*Малюнак домры*

**Вядучая:** Домра – беларускі народны струнны шчыпковы музычны інструмент. Домра выкарыстоўваецца як сольны інструмент, так і ў саставе ансамбляў і аркестраў. Домра шырока выкарыстоўвалася скамарохамі ў 16-17 стагоддзях.

**Вядучая:** А зараз прапаную адгадаць, які музычны інструмент гучыць.

*Гульня-загадка “ Музычныя найгрышы”*

1. Акарына
2. Колавая ліра
3. Дуда
4. Трашчотка
5. Цымбалы
6. Жалейка
7. Домра

**Вядучая:** Малайцы! Як вы думаеце, дзе можна пачуць гэтыя інструменты? (адказы). Так, на канцэртах, фестывалях, творчых пляцоўках. Музычныя інструменты выкарыстоўваюць як у песнях, танцах, так і асобна. Не адзін беларускі танец не абыходзіцца без музычнага інструмента. Ён надае асобы каларыт і характар танцу. І зараз мы з вамі станцуем беларускі побытавы танец “Картузэ”.

*Танец Картузэ*

**Вядучая:** Выдатна! Вось цяпер будзеце ведаць такі танец і можаце навучыць яму сваіх сяброў. І вас чакае наступнае заданне: трэба правільна суаднесці назву інструмента і яго апісанне. Спачатку давайце падзелімся на 3 каманды. Кожнай камандзе выдаецца ліст, на якім змешчана ўся інфармацыя. Хто хутчэй справіцца – падымайце руку. Зразумела? Пачынаем!

*Заданне з лістамі*

1. Гук атрымліваецца, калі па ім б'юць драўлянымі палачкамі (цымбалы)
2.Выкарыстанне гэтага інструмента аналагічна лясканню ў далоні ці прытопванню (трашчотка)
3. Сакральны інструмент (дуда)
4. Сродак заробку на хлеб (ліра)
5. Візітная картка скамарохаў (домра)
6. Выраблены з гліны (акарына)
7. Яго выкарыстоўвалі пастухі, калі пасвілі жывёл (жалейка)

**Вядучая:** Вельмі добра! Як бачыце, кожны музычны інструмент мае сваё прызначэнне. А зараз згуляем у гульню, якая называецца “Грушка”

*Гульня “Грушка”*

**Вядучая:** Якія вы Малайцы! Гульня – гэта не толькі добры настрой, але ж фізічная актыўнасць, якая добра паўплывае на арганізм дзіцяці. Пакуль вы будзеце адпачываць, прапаную адгадаць загадкі, звязаныя з музычнымі інструментамі. Увага на экран!

**Загадкі:**

1. Ляжыць - маўчыць, а возьмеш - заплача. (скрыпка)

2. Сама доўгая, бок дзіравы, канец закручысты, а пішчыць. (жалейка)

3. І  поўна, і роўна, канцы іграюць. (дуда)

4. За лесам палянскім, за полем лясанскім крычыць Кацярына голасам шатанскім. (труба)

5. Сам пусты, голас густы, дроб выбівае, людзей збірае. (барабан)

6. На рамні ў радок вісіць, суха, весела трашчыць.

Рытм адстуквае выразна гучны інструмент. (трашчотка)

7. Тонкая, стройная, як змейка, а завуць яе…(жалейка)

**Вядучая:** Як добра вы ведаеце музычныя інструменты! Што ж, засядзеліся мы з вамі. Прыйшоў час і патанчыць! Запрашаю на танец “Верабей”!

*Танец “Верабей”*

**Вядучая:** Ці спадабаўся вам танец? (адказы). Добра! І на прыканцы нашай праграмы прапаную паглядзець музычны мультфільм,пасля прагляду якога вы адкажаце, якія народныя інструменты вы пачулі.

*Мультфільм “Песня жаваронка”*

**Вядучая:** Спадзяюся, вы змаглі пачуць і адгадаць, якія музычныя інструменты былі выкарыстаны ў гэтым мульціку. Хто можа пералічыць? (адказы)

**Вядучая:** Выдатна! Я вельмі рада, што вы так уважліва праслухалі дадзены матэрыял, актыўна ўдзельнічалі ў заданнях і гульнях, навучыліся танчыць бытавыя танцы і цяпер можаце адрозніць гучанне аднаго музычнага інструмента ад другога. Наша праграма падыйшла да канца.

**Вядучая:** Вялікі дзякуй ўсім за ўвагу! Да новых сустрэч!

*Спіс выкарыстанай літаратуры:*

1. Аляхновіч А. М., Рахчэеў М. В., Фядосік А. С., Каструлёў У. Дз. Беларускі дзіцячы фальклор. Традыцыйныя запісы, апрацоўкі і аўтарскія творы. Мінск “Беларусь”, 1994.

2. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.;Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал.рэд. ) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.